В.М.Астрога

# Падрыхтоўка настаўніцкіх кадраў у Беларусі

## (другая палова XIX – пачатак XX стагоддзя)

Развіццё капіталізму і новыя грамадска-палітычныя адносіны ў Расіі, выкліканыя адменай прыгоннага права, далі штуршок для больш шырокага распаўсюджання народнай асветы. Школьная рэформа, якая пачала праводзіцца ў 60-ыя гады XIX стагоддзя, непазбежна вылучала праблему педагагічных кадраў. Без яе вырашэння сур'ёзная рэарганізацыя школьнай сістэмы была немагчыма. Рускі педагог К.Д.Ушынскі адзначаў, што "самы істотны недахоп у справе рускай народнай асветы ёсць недахоп добрых настаўнікаў, спецыяльна падрыхтаваных да выканання сваіх абавязкаў" [9, с. 339]. У якасці прыкладу ён прывёў пастаноўку школьнай справы ў Прусіі, дзе ўжо дзейнічалі 50 настаўніцкіх семінарый, але пры гэтым лічылася, што такой колькасці яшчэ недастаткова для патрэб 17-мільённага насельніцтва.

*Валянціна Міхайлаўна Астрога ў 1990 годзе скончыла гістарычны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Працавала настаўніцай гісторыі педагагічнай гімназіі г.Мінска. У цяперашні час — выкладчык кафедры гісторыі Беларусі і паліталогіі Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага універсітэта.*
*Кандыдат гістарычных навук. Абараніла дысертацыю на тэму "Вясковае настаўніцтва Беларусі ў другой палове XIX — пачатку XX стагоддзя".*
*Аўтар 23 навуковых артыкулаў.*
*Сфера навуковых інтарэсаў — народная адукацыя Беларусі другой паловы XIX — пачатку XX стагоддзя.*

Пасля падзення прыгону ў Расійскай імперыі не было ніводнай настаўніцкай семінарыі. Праўда, у 1834—1839 гадах у Віцебску існавала першая на Беларусі спецыяльная навучальная ўстанова, якая рыхтавала настаўнікаў для падрыхтоўчых класаў гімназій, прыходскіх і павятовых вучылішчаў. За гэты перыяд установа выпусціла 62 педагогі. Закрылася яна з-за адсутнасці сродкаў, што стала вынікам рэакцыйнай палітыкі, якую праводзіў царскі ўрад у адносінах да народнай адукацыі. Больш таго, у адукацыі часта працавалі выпадковыя людзі. У 1860—1870 гадах пасады настаўнікаў амаль поўнасцю займалі прадстаўнікі духоўнага саслоўя або выхадцы з адукаваных сялян і мяшчан. Так, напрыклад, у 124 школах Магілёўскай губерні выкладалі 14 святароў, 21 прычотнік, 25 валасных пісараў, 6 дваран, 6 адстаўных салдат, 1 семінарыст, 51 селянін і мешчанін [1].

У сярэдзіне XIX стагоддзя грамадства і прыватныя асобы выступілі з ініцыятывай аб адкрыцці педагагічных навучальных устаноў (напрыклад, вядомы хірург і педагог М.І.Пірагоў – у Кіеве, педагог-метадыст В.А.Золатаў — у Пецярбургу).

Кіруючыся палітычнымі матывамі, выкліканымі ў першую чаргу паўстаннем 1863 года і паланізацыяй беларускага насельніцтва, ініцыятыву адкрыцця педагагічных навучальных устаноў пераняў царскі ўрад. Апекуну Віленскай навучальнай акругі князю А.П.Шырынскаму-Шыхматаву належала задума заснаваць у Паўночна-Заходнім краі

спецыяльныя **настаўніцкія семінарыі**, якія павінны былі рыхтаваць настаўнікаў як праваднікоў і абаронцаў рускай нацыі. У 1864 годзе пачала працаваць Маладзечанская настаўніцкая семінарыя. Яна мела двухгадовы тэрмін навучання, бо на больш працяглы курс разлічваць не прыходзілася з-за адсутнасці грошай і належных выкладчыцкіх кадраў. Меркавалася адкрыць два класы і прыняць 80 выхаванцаў.

Першыя вучэбныя планы і праграмы адрозніваліся значнай абмежаванасцю. Асноўнымі лічыліся прадметы, веданне якіх было неабходна для практычнай настаўніцкай дзейнасці. Прадугледжвалася вывучэнне Закону Божага, рускай і царкоўнаславянскай моў, арыфметыкі, чыстапісання і спеваў. Невялікая колькасць гадзін адводзілася на рускую гісторыю і геаграфію, методыку выкладання ў пачатковай школе. Тым не менш, нягледзячы на неііматлікасць вучэбных дысцыплін, у першы год працы ўстановы не менш як дзве трэці яе навучэнцаў былі выключаны за непаспяховасць [10]. Семінарыю неаднаразова наведвалі апекуны Віленскай навучальнай акругі, генерал-губернатар, а ў 1872 годзе — нават міністр асветы Д.А.Талстой.

На аснове першага вопыту ў 1870 годзе зацверджана новае "Палажэнне аб настаўніцкіх семінарыях", згодна з якім яны пераўтвараліся ў трохкласныя. На ўзор Маладзечанскай адкрыліся семінарыі ў Полацку і Паняцежы (1872), Нясвіжы (1875) і Свіслачы (1876). На вучобу прымаліся асобы ва ўзросце 16—18 гадоў, пераважна сялянскага саслоўя, выключна праваслаўнага веравызнання, без фізічных недахопаў і свабодныя ад рэкруцкай павіннасці. Да заявы-прашэння прыкладаліся метрычныя пасведчанні аб нараджэнні і хрышчэнні, дакумент аб паспяховасці і добрых паводзінах (ад прыходскага святара). Акрамя таго, здаваліся іспыты ў аб'ёме праграм для пачатковых народных школ.

На думку міністэрскіх чыноўнікаў, веды вясковага настаўніка павінны былі вызначацца не глыбінёй, а трываласцю і грунтоўнасцю. Асаблівая ўвага ўдзялялася педагагічнай практыцы. У другім класе выхаванцы выступалі пасіўнымі назіральнікамі. Пробныя ўрокі па арыфметыцы і рускай мове давалі пачынаючы з трэцяга класа. Семінарысты самастойна распрацоўвалі план урока, складалі канспект і праводзілі заняткі ў прысутнасці выкладчыкаў і сваіх таварышаў, пасля чаго рабіўся разбор урока і абмяркоўваліся заўвагі. Навучэнцы знаёміліся з дакументацыяй школы, запаўненнем класнага журнала, правяралі вучнёўскія сшыткі і г.д.

Вучні настаўніцкіх семінарый асвойвалі розныя рамёствы, садаводства і агародніцтва. Напрыклад, у Маладзечанскай семінарыі практыкавалася пляценне кошыкаў і мэблі. Пры наведванні яе міністрам асветы навучэнцы паднеслі яму плеценыя крэсла і кошык для паперы, зробленыя вельмі старанна і якасна. Пазней было ўведзена навучанне сталярству і выпільванню.



*Гарадское вучылішча ў Навагрудку*

У канцы XIX стагоддзя набор у настаўніцкія семінарыі па выніках прыёмных іспытаў складаў 170—190 чалавек. Але далёка не ўсе атрымлівалі пасведчанні: у 1899 годзе існуючыя на той момант 4 настаўніцкія семінарыі выпусцілі толькі 79 спецыялістаў, у 1900-ым — 84. Аналіз статыстычных даных паказвае, што найбольш распаўсюджанымі прычынамі для звальнення з'яўляліся адсутнасць матэрыяльных сродкаў (у палове выпадкаў), сямейныя абставіны, хвароба, малапаспяховасць. Са справаздачы класнага кіраўніка Рагачоўскай семінарыі, датаванай 1910 годам, бачна, што з 40 вучняў па ўсіх

прадметах паспявалі толькі 25. Больш за ўсё нездавальняючых адзнак мелася па такіх дысцыплінах, як руская мова, арыфметыка і геаметрыя [5]. Тыя, хто не вытрымліваў пераводных экзаменаў, пакідалі ўстанову. У канцы XIX — пачатку XX стагоддзя ўзрасла колькасць выхаванцаў, якія былі выключаны па палітычных матывах.

З 1907 года ў семінарыях Беларусі ўводзіцца чатырохгадовы курс навучання. Павялічваецца аб'ём вучэбнага часу, адведзенага на вывучэнне Закону Божага, рускай і славянскай моў, арыфметыкі, геаметрыі, педагогікі, методыкі выкладання ў пачатковай школе і практычныя заняткі, што аказвае станоўчы ўплыў на агульнаадукацыйны і прафесійны ўзровень будучых настаўнікаў. Рост школьнай сеткі прымушае ўрад адкрываць новыя сярэднія педагагічныя навучальныя ўстановы. Так, у 1909 годзе арганізуецца Рагачоўская семінарыя, а з 1 ліпеня 1911 года пачынае працаваць першая ў акрузе жаночая Аршанская настаўніцкая семінарыя, куды набіраюцца дзяўчаты 14-гадовага ўзросту (агульная колькасць выхаванак — 120 чалавек). Вучэбна-выхаваўчая дзейнасць жаночых семінарый будуецца на ўзор мужчынскіх, толькі замест ручной працы выкладаецца рукадзелле. У 1914 годзе заснавана Барысаўская жаночая, у 1915-ым — Гомельская, у 1916 годзе — Бабруйская жаночая семінарыі, якія паступова пераўтвараюцца ў шматкамплектныя ўстановы адукацыі.

Разнастайныя інструкцыі і палажэнні аб адукацыйным працэсе прадугледжвалі падрыхтоўку спецыялістаў, адданых цару і царкве. Урад прымаў меры па ахове настаўніцкіх семінарый "ад уплыву зламысных людзей, якія імкнуцца ўцягнуць навучэнцаў у тайныя гурткі і таварыствы". Цыркулярам 1877 года дырэктары былі папярэджаны, што ў выпадку падазрэнняў вучняў у палітычнай і маральна-рэлігійнай нядобранадзейнасці тыя павінны быць выключаны, нягледзячы на выдатныя здольнасці і паводзіны [8]. Фактычна ўстанавілася сістэма вышуку і паліцэйскага нагляду за вучнямі. Хоць семінарыі і абвяшчаліся адкрытымі навучальнымі ўстановамі, але ў іх дзейнічалі правілы, уласцівыя закрытым. У абавязкі выкладчыкаў уваходзіў і ўсебаковы строгі кантроль за жыццём семінарыстаў, што расцэньвалася як "выхаванне". Узрастала роля святара, які па сваім службовым становішчы набліжаўся да дырэктара. Ён сачыў не толькі за ўсімі кірункамі вучэбна-выхаваўчай работы, але і за поглядамі, настроем навучэнцаў, падаўляў любыя праявы вальнадумства і пратэсту.

1 жніўня 1877 года прыняты спецыяльныя "Правілы для выхаванцаў настаўніцкіх семінарый Віленскай навучальнай акругі", у якіх вызначаліся асноўныя абавязкі вучняў і нормы іх паводзін, у першую чаргу адносна выканання рэлігійных прадпісанняў: штодзённая ранішняя і вячэрняя малітвы, наведванне царквы пры семінарыі, трыманне пастоў, споведзь. Прадугледжваліся абавязковая прысутнасць на занятках, стараннае выкананне ўсіх заданняў, падтрыманне парадку і цішыні, павага да настаўнікаў. У 1881 годзе зацверджаны правілы аб спагнаннях, якія замацоўвалі адказнасць усяго класа за парушэнне. Яны з'яўляліся своеасаблівым кодэксам аб пакараннях, галоўныя з якіх — вымовы, стаянне ў куце ці каля дзвярэй, запісы ў штрафны журнал, звальненне з семінарыі з правам ці без права паступлення ў іншыя навучальныя ўстановы.

Адукацыя ў семінарыі была бясплатнай. Але за сваё пражыванне і харчаванне выхаванцы плацілі самастойна. Вучні падзяляліся на тых, хто атрымліваў стыпендыю ад дзяржавы (казённакоштныя), і тых, хто яе не меў (своекоштныя). Пасля заканчэння ўстановы стыпендыяты павінны былі прaслужыць на пасадзе настаўніка не менш як чатыры гады або вярнуць у казну ўсю выдаткаваную на іх навучанне суму (адзнаку аб гэтым рабілі на адваротным баку пасведчання аб адукацыі). Так, згодна з запісам, вядомы беларускі пісьменнік М.Лынькоў, які вучыўся ў Рагачове, пакідаючы працу ў школе, абавязаны быў выплаціць 330 рублёў.

Далёка не пры ўсіх настаўніцкіх семінарыях меліся інтэрнаты. Напрыклад, навучэнцы Маладзечанскай семінарыі жылі на прыватных кватэрах, звычайна па чатыры чалавекі, у цёмных, часам з земляной падлогай, змазанай глінай, пакоях. Такія ўмовы і вельмі сціплы бюджэт прыводзілі да частых захвор-

ванняў і пропускаў заняткаў. Пазней казённакоштных перавялі ў асобнае памяшканне, дзе яны харчаваліся разам, "у арцельным стале". Своекоштныя заставаліся на кватэрах і харчаваліся звычайна паасобку, як прыходзілася. Па ўспамінах былога семінарыста А.А.Селівончыка, які вучыўся ў 1904–1908 гадах у Маладзечне, "у час снядання, абеду і вячэры прыходзілі ў інтэрнат і рабілі засаду, каб не бачыў дзяжурны настаўнік. Калі выхаванцы пакідалі сталоўку, рабілі атаку на сталы, збіралі кавалкі і рэшткі стравы ў адну талерку..." [3, л. 6]. Многія выхаванцы прасілі педсаветы назначыць ім грашовыя дапамогі, бо не маглі спадзявацца на падтрымку нямоглых або бедных бацькоў.

Афіцыйна лічылася, што настаўніцкія семінарыі ўтрымліваліся за кошт казны. Зразумела, асноўныя сродкі выдзяляла дзяржава. Але пасільную дапамогу аказвалі і сялянскія грамадствы (напрыклад, Віцебскай і Магілёўскай губерняў), якія зацвердзілі ў Полацкай настаўніцкай семінарыі адпаведна 10 і 30 стыпендый па 100 рублёў кожная. Пэўныя сродкі паступалі ад прыватных асоб і праваслаўных брацтваў, якія мелі сваіх стыпендыятаў.

Нягледзячы на тое, што добра забяспечыць матэрыяльна-тэхнічную базу навучальных устаноў было цяжка, многія пытанні ўсё ж вырашаліся станоўча. Семінарыі размяшчаліся як у наёмных, так і спецыяльна адведзеных памяшканнях. Практычна пры ўсіх установах ствараліся педагагічныя музеі, будынкі пачатковых вучылішчаў, майстэрні, пры інтэрнатах – лазні. У абавязковым парадку побач знаходзілася свая дамавая царква. Семінарыі мелі таксама ўласныя бібліятэкі, фонды якіх можна назваць дастатковымі. З 1870 года пры Маладзечанскай, з 1872-га – Полацкай, з 1900 года – Нясвіжскай семінарыях працавалі метэаралагічныя станцыі. З адукацыйнымі і выхаваўчымі мэтамі звычайна падчас летніх і зімніх вакацый арганізоўваліся экскурсіі ў культурныя цэнтры Расіі.

**Педагагічныя курсы** як тып навучальных устаноў для падрыхтоўкі настаўнікаў пачатковых школ пачалі ўзнікаць у пачатку XX стагоддзя. Дырэктар народных вучылішчаў Мінскай губерні адзначаў: "Існуючыя семінарыі не могуць задаволіць патрэбы ў настаўніках, а адкрываць іх у вялікай колькасці нельга: семінарыі вельмі дорага каштуюць. Давядзецца звярнуцца да больш таннага і больш хуткага сродку" [6, л. 532]. 31 сакавіка 1900 года міністэрства народнай асветы зацвердзіла "Правілы аб педагагічных курсах" з мэтай "падрыхтаваць маладых людзей, атрымаўшых ніжэйшую адукацыю, да іспытаў



*У.Я.Макоўскі.*
*«Прыезд настаўніцы». 1896 год*

на званне настаўніка пачатковага вучылішча і азнаёміць тэарэтычна і практычна з пастаноўкай і вядзеннем пачатковага навучання" [7, л. 13]. На вучобу без іспытаў прымаліся маладыя людзі, якія дасягнулі 16-гадовага ўзросту і скончылі не ніжэй як гарадское, лавятовае ці духоўнае вучылішча. Навучанне працягвалася адзін год. Тэарэтычныя заняткі складаліся з паўтарэння і засваення звестак па агульнаадукацыйных прадметах, вывучэння асноў дыдактыкі і методыкі пачатковага навучання, азнаямлення з вучэбнымі дапаможнікамі. Практычныя заняткі ўключалі пробныя ўрокі і іх падрабязны разбор. Такія курсы набылі пэўнае распаўсюджанне дзякуючы сваёй таннасці і кароткаму тэрміну падрыхтоўкі. Але зразумела, што аднаго года вельмі мала, каб выхаваць адукаваных асоб і падрыхтаваць кваліфікаваных спецыялістаў, якія добра валодаюць методыкай прафесійнай дзейнасці.

У 1907 годзе міністэрствам уведзены новыя правілы арганізацыі педагагічных курсаў, згодна з якімі тэрмін навучання павялі-

чыўся да двух гадоў. Павышаны патрабаванні да будучых слухачоў: пачалі практыкавацца ўступныя іспыты. Пры адсутнасці адзіных планаў і праграм яны распрацоўваліся кожнай сярэдняй навучальнай установай, пры якой адкрываліся курсы (гімназія, прагімназія, рэальнае вучылішча), і зацвярджаліся апекуном, з'яўляючыся па сваім змесце скарочаным варыянтам зместу адукацыі ў настаўніцкіх семінарыях. Курсы працавалі ў Магілёве, Мсціслаўі, Навагрудку, Гомелі, Віцебску, Гродне. Кароткі тэрмін навучання, безумоўна, не даваў магчымасці павырыць колькасць устаноўленых праграмай прадметаў і аб'ём ведаў па іх, адчуваўся і недахоп сродкаў на якаснае правядзенне заняткаў. Аднак у сітуацыі дэфіцыту настаўніцкіх кадраў педагагічныя курсы былі ўстановай не толькі пажаданай, але і неабходнай.

Пэўную ролю ў папаўненні кантынгенту настаўнікаў адыгралі **жаночыя навучальныя ўстановы**. На аснове "Палажэння аб педагагічных класах" для падрыхтоўкі настаўніц пры жаночых гімназіях, якія давалі дастаткова грунтоўную агульнаадукацыйную падрыхтоўку, пачалі дзейнічаць дадатковыя восьмыя класы. Першыя з іх узніклі на Беларусі ў 1906 годзе ў Полацку. Акрамя агульнаадукацыйных прадметаў, тут выкладаліся замежныя мовы, педагогіка, дыдактыка, музыка і рукадзелле. У параўнанні з семінарыямі і курсамі практыка ў педагагічных класах была арганізавана значна горш: выхаванкі ў асноўным з'яўляліся пасіўнымі наглядальнікамі.

У пачатковых школах духоўнага ведамства настаўніцкія абавязкі выконвалі пераважна члены прычту. Толькі з 1884 года, пасля зацвярджэння "Палажэння аб царкоўнапрыходскіх вучылішчах", пад кіраўніцтвам духавенства пачалі адкрывацца **царкоўна-настаўніцкія школы**. Яны былі прадстаўлены навучальнымі ўстановамі двух тыпаў: другакласныя ("второклассные"), якія выпускалі настаўнікаў для школ граматы (функцыяніравалі пры царквах і давалі элементарныя веды), і непасрэдна царкоўна-настаўніцкія, што рыхтавалі "вучачых усіх разрадаў". Упершыню такія ўстановы ўзніклі ў Магілёўскай епархіі.

У другакласныя школы з трохгадовым тэрмінам навучання прымаліся маладыя асобы ва ўзросце 13–17 гадоў, якія скончылі пачатковыя навучальныя ўстановы. Таксама дазвалялася набіраць дзяўчат, якія атрымалі дамашнюю адукацыю. Паступаючыя здавалі праверачныя іспыты. У школах выкладаліся Закон Божы, агульная і руская царкоўная гісторыя, царкоўныя спевы, руская мова, царкоўнаславянская мова, айчынная гісторыя, геаграфія, арыфметыка, геаметрычнае чарчэнне і маляванне, асновы дыдактыкі, пачатковыя звесткі па гігіене, чыстапісанне і рукадзелле (у жаночых школах). У якасці неабавязковых прадметаў уводзіліся іканапіс, музыка, навучанне рамяству і сельскай гаспадарцы. Практычная падрыхтоўка праходзіла ў аднакласных царкоўнапрыходскіх школах, якія знаходзіліся пры другакласных. У 1907 годзе ў 20 другакласных установах царкоўнага ведамства навучаліся 1183 чалавекі (каля 60 у кожнай). У 1913 годзе ў Магілёўскай губерні налічвалася 9 другакласных школ, сярод іх – 5 жаночых, Гродзенскай – 8, Полацкай – 6 другакласных школ [4].

Больш прыстасаванымі для патрэб народнай адукацыі былі царкоўна-настаўніцкія школы, навучанне ў якіх працягвалася тры гады. Сюды паступалі юнакі і дзяўчаты ва ўзросце 15–17 гадоў, якія скончылі навучальныя ўстановы з аб'ёмам ведаў, не ніжэйшым за той, што давалі двухкласныя школы. У параўнанні з другакласнай школай, праграма тут адрознівалася значнай разнабаковасцю. Акрамя адзначаных вышэй дысцыплін, выкладаліся асновы педагогікі, гісторыя літаратуры, звесткі аб прыродзе, яе сілах і з'явах, больш шырокімі сталі курсы па гісторыі, геаграфіі і іншых прадметах. Навучанне іканапісу, рамёствам, сельскай гаспадарцы, царкоўным спевам, музыцы ажыццяўлялася ў форме факультатыўных заняткаў. У 1885–1892 гадах пачалі працаваць Пустынская, Міласлаўская, Навабыхаўская, Выдрынская царкоўна-настаўніцкія школы Магілёўскай губерні, а таксама школа з сельскагаспадарчым ухілам ва ўрочышчы "Ставок" Бельскага павета Гродзенскай губерні, дзе вучыліся 49 выхаванцаў.

Пры назначэнні на вакантныя выкладчыцкія пасады ў аднакласныя народныя вучылішчы асобы, якія мелі званне настаўніка царкоўнапрыходскай школы, не здавалі дадатковага экзамену. Выкладаць жа ў штатных двухкласных вучылішчах яны не маглі, пакуль не праходзілі ўсіх іспытаў на званне настаўніка пачатковага народнага вучылішча. Жадаючых трапіць на працу ва ўстановы міністэрства народнай адукацыі было нямала, што выклікана больш правільнай пастаноўкай школьнай справы ў параўнанні са школамі царкоўнага ведамства.

**Настаўніцкія з'езды, кароткатэрміновыя педагагічныя курсы, курсы па прыродазнаўстве, агародніцтве, пчалаводстве, садаводстве, царкоўных спевах** таксама служылі своеасаблівымі формамі прафесійнай падрыхтоўкі. Найбольш мэтазгоднымі з іх можна лічыць кароткатэрміновыя педагагічныя курсы, якія арганізоўваліся ўлетку ў губернскіх і павятовых гарадах згодна з "Часовым правілам для арганізацыі курсаў" (1899). Падчас заняткаў слухачоў знаёмілі з новымі падручнікамі, вучэбнымі дапаможнікамі, праводзілі чытанні па педагогіцы. У канцы навучання курсісты самі давалі пробныя ўрокі, якія затым калектыўна абмяркоўваліся. Але такіх курсаў было недастаткова і знаходзіліся яны ў бядотным становішчы, бо не мелі сваіх памяшканняў, кваліфікаваных выкладчыкаў, часам базы для практыкі і, што самае галоўнае, неабходнага фінансавання. Атрымаць званне настаўніка дазвалялася і экстэрнам, для чаго ў залежнасці ад узроўню папярэдняй адукацыі здаваліся поўныя ці скарочаныя іспыты.

З мэтай падрыхтоўкі настаўнікаў гарадскіх вучылішчаў міністэрствам прынята рашэнне аб стварэнні **настаўніцкіх інстытутаў**. Так, у 1873 годзе распачалася дзейнасць Віленскага (яўрэйскага), а ў 1874-ым – Віленскага (рускага) настаўніцкіх інстытутаў. Згодна з палажэннем ад 31 сакавіка 1872 года яны павінны былі забяспечваць атрыманне незакончанай вышэйшай адукацыі. Інстытуты з'яўляліся ўстановамі закрытага тыпу і ўтрымліваліся за кошт казны, прычым выхаванцы атрымлівалі дзяржаўныя стыпендыі. На вучобу прымаліся асобы, якія пас-



*Нядзельныя госці ў настаўніка (з карціны М.П.Багданава-Бельскага)*

пяхова вытрымлівалі ўступныя экзамены, не маладзей 16 гадоў, без фізічных недахопаў. Перавага аддавалася выпускнікам сярэдніх навучальных устаноў і настаўніцкіх семінарый, якія адпрацавалі ў пачатковых школах не менш двух гадоў. На працягу трохгадовай вучобы ў Віленскім (рускім) настаўніцкім інстытуце, згодна з планам і праграмамі, выкладаліся Закон Божы, педагогіка, дыдактыка, руская і царкоўнаславянская мовы, арыфметыка і пачаткі алгебры, геаметрыя, усеагульная гісторыя і гісторыя Расіі, усеагульная геаграфія і геаграфія Расіі, прыродазнаўства і фізіка, чарчэнне, маляванне, чыстапісанне, спевы і гімнастыка. З 1910 года факультатыўна ўведзены замежныя мовы, пашыраны змест навучальных праграм. Прыярытэтнай прызнавалася педагагічная і метадычная падрыхтоўка будучага настаўніка, у той час як агульнаадукацыйная абмяжоўвалася дысцыплінамі, якія вывучаліся ў гарадскім вучылішчы. Спецыялізацыя адсутнічала, таму рыхтаваўся спецыяліст шырокага профілю, які б мог даваць урокі па ўсіх ці некалькіх прадметах. Для правядзення практычных заняткаў пры настаўніцкіх інстыту-

тах дзейнічалі ўзорныя гарадскія вучылішчы. Узбагачэнню прафесійнага вопыту садзейнічала значная колькасць дадзеных навучэнцамі пробных урокаў, якія потым дэталёва аналізаваліся на сумесных нарадах разам з выкладчыкамі.

Новыя настаўніцкія інстытуты створаны толькі ў пачатку XX стагоддзя ў губернскіх гарадах — Віцебску (1910), Магілёве (1913) і Мінску (1914). Адкрыццё кожнага з іх ператварылася ў сапраўдную ўрачыстасць з удзелам прадстаўнікоў міністэрства народнай адукацыі, апекуна навучальнай акругі, шырокага кола грамадскасці.

Недахопы, якія існавалі ў тагачаснай педагагічнай адукацыі, урад імкнуўся выправіць пасля Лютаўскай рэвалюцыі 1917 года. У адпаведнасці з новым "Палажэннем аб настаўніцкіх семінарыях і інстытутах" пашырaліся вучэбныя праграмы. Істотнае значэнне мела ўключэнне ў іх такіх дысцыплін, як трыганаметрыя, хімія, касмаграфія і сельскагаспадарчая вытворчасць. (Аднак напранейшаму адсутнічалі замежныя мовы, мала часу адводзілася на некаторыя агульнаадукацыйныя прадметы.) На першы курс настаўніцкага інстытута маглі паступаць толькі асобы з сярэдняй адукацыяй. Усе нaваўвядзенні прадугледжвалі грунтоўную падрыхтоўку настаўніка-прадметніка, а не выкладчыка шырокага профілю, як гэта было раней [2].

Такім чынам, на працягу другой паловы XIX — пачатку XX стагоддзя ў Беларусі склалася поўная сістэма прафесійнага навучання настаўніцкіх кадраў. Пры адсутнасці вышэйшых адбываўся працэс станаўлення і развіцця сярэдніх педагагічных навучальных устаноў, да якіх адносіліся настаўніцкія семінарыі, педагагічныя курсы і восьмыя педагагічныя класы жаночых гімназій. З мэтай падрыхтоўкі настаўнікаў гарадскіх і вышэйшых пачатковых вучылішчаў адкрыты настаўніцкія інстытуты, якія рыхтавалі лепшых для свайго часу спецыялістаў. Маючы нядрэнную матэрыяльна-тэхнічную базу для навучання, дастаткова кваліфікаваных выкладчыкаў, распрацаваныя планы і праграмы, настаўніцкія семінарыі і інстытуты забяспечвалі магчымасць атрымання будучымі педагогамі тэарэтычнай і практычнай падрыхтоўкі. Навучальныя ўстановы духоўнага ведамства (двухкласныя і царкоўна-настаўніцкія школы, кароткатэрміновыя курсы) адносіліся да ніжэйшых. Разам з тым яны адыгралі станоўчую ролю ў павышэнні пісьменнасці сельскіх жыхароў. За гэтыя складаныя дзесяцігоддзі быў набыты каштоўны вопыт, створаны багаты арсенал формаў і метадаў прафесійнай адукацыі.


1. *Золотов, В.* Записка о сельской грамотности в Могилёвской губернии / В.Золотов. — СПб., 1864.
2. *Кравцов, А.И.* Педагогическое образование в Белоруссии в доoктябрьский период / А.И.Кравцов // Уч. зап. Минского гос. пед. ин-та иностр. языков. Сер. педагогическая. — 1958. — Вып. 1. — С. 3—63.
3. Мінскі абласны краязнаўчы музей г.Маладзечна. — Папка 16 (матэрыялы па былой настаўніцкай семінарыі ў г.Маладзечна). — Л. 6.
4. Народное образование в церковно-приходских школах Могилёвской епархии в 1913/14 уч. г. — Могилёв, 1915.
5. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). — Ф. 3260, воп. 1, спр. 22, л. 7.
6. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). — Ф. 458, воп. 1, спр. 490, л. 532.
7. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). — Ф. 2254, воп. 2, спр. 266, л. 13.
8. *Сянькевіч, Г.* Паслядоўнікі К.Д.Ушынскага ў Беларусі (60—90-ыя гг. XIX ст.) / Г.Сянькевіч // Народная асвета. — 1974. — № 3. — С. 14—17.
9. *Ушинский, К.Д.* Избранные произведения / К.Д.Ушинский. — М., 1968.
10. *Ярушевич, А.* Молодечно и его учебные заведения / А.Ярушевич. — Вильна, 1914.